УДК 821.161.3.09УДК

# ГЛАБАЛЬНАСЦЬ ДАБРА І ЗЛА (АДВЕЧНЫ МАТЫЎ НАРОДНАЙ МІФАЛОГІІ І ПАЭМЫ А. КУЛЯШОВА "ЦУНАМІ")

**Ненадавец Аляксей Міхайлавіч**
прафесар кафедры беларускай і рускай моў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт"; доктар філалагічных навук, прафесар
(г. Мінск, Беларусь)

*Ключавыя словы: дабро, зло, глабальнасць, праблема, міфалогія, вуснапаэтычная творчасць, паэма, сацыяльны, філасофскі, чалавек, чалавецтва.*

*У артыкуле прадстаўлены аналіз філасофскага зместу паэмы Аркадзя Куляшова "Цунамі" ў кантэксце эвалюцыі міфалагічнай бінарнай апазіцыі дабра і зла ў народнапаэтычнай культуры і гісторыі развіцця чалавецтва.*

Кожны з нас задумваўся над гэтай праблемай. Амаль няма ў свеце такога чалавека, для якога б узаемаадносіны дабра і зла былі б пустым гукам. Не здзіўляе і тое, што любы пачынае задумвацца над гэтым, калі ён "выспявае" для тонкага (філасофска-сацыяльнага) асэнсавання. Для творцы – тым болей. Ён расце ў сваіх разважаннях і творах, адчувае мастакоўскую сілу, разумее, калі можа прыступіць да асэнсавання больш значных задач і праблем. Яны ж запроста могуць "утапіць" нават самага разумнага ў сваёй глабальнасці, маштабнасці, неабсяжнасці. Таму і А. Куляшоў не спяшаўся з паскарэннем у плане той самай глабальнасці і празмернай напоўненасці філасофскімі матывамі ўласнай творчасці. Адшліфоўваў майстэрства, самаўдасканальваўся ажно да таго моманту (рубяжа, знаку), калі адчуў, што цяпер яму па сілах вырашэнне і гэтай тэмы. Так з'явілася знакавая паэма "Цунамі". Пра яе не вельмі многа і, як зараз здаецца, то не надта глыбока пісалі даследчыкі. Неяк яна прамільгнула міма поглядаў крытыкаў, а дарма. Нам падаецца, што творца якраз тады і знаходзіўся ў той самай мастакоўскай сіле, калі мог смела заявіць, падаць свой голас у абарону Дабра, сусветнага Дабра, вечнай яго інстанцыі.

Агульнавядома, што сіла зла неабмежаваная. І самае галоўнае – пастаянна папаўняецца. А ўсё адбываецца з-за таго, што на кожную праяву зла заўсёды адклікаецца такое ж самае зло, толькі шматкроць памножанае. Атрымліваецца (і тут мы не з'яўляемся першаадкрывальнікамі), што, творачы зло, той, хто гэта робіць, здзяйсняе ўсё на зло сабе ў першую чаргу,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

уводзіць у “зону павышанай рызыкі” сваіх родных і блізкіх. Цікава і іншае – ён не спыняецца! Не выключана, што ён проста ўжо не можа спыніцца, а дзейнічае спантанна, “па інерцыі”. Тут на самай справе атрымліваецца, што дзеянне значна апярэджвае думку, разважанні, здольнасць цвяроза ацэньваць сітуацыю, яе наступствы. “Стваральнік” зла заходзіцца ў сваёй ярасці, але ўсё роўна спыніцца ён можа толькі ў сваім бяссіллі! Ды бяда ў тым, што ніхто да гэтага часу не можа (і не зможа!) дакладна акрэсліць мяжу той адмоўнай энергіі, той рубеж, дзе яна і сапраўды захлынецца ва ўласным бяссіллі. Дакладней, у бяссіллі адмоўных імпульсаў, энергіі. Называць можна па-рознаму, сутнасць застанецца адна і тая ж.

У пацвярджэнне нашых слоў аб вывучэнні жыццёвых праблем, аб спробе прыступіць да асэнсавання больш складанага, гаворыць і выказванне самога А. Куляшова (яшчэ нават задоўга да напісання паэмы): “Разумею, што дрэнна, павярхоўна ведаю жыццё, а пра тое, што ведаю, пяю, як кажуць, не ўласцівым для мяне голасам. Усё часцей і часцей звяртаюся да крыніц народнай творчасці...” [3, с. 325].

Яно і не здзіўляе, што вядомы ўжо майстра слова акцэнтуе сваю ўвагу на скарбонцы духоўнага багацця народа. Менавіта да яе звярталіся самыя слынныя творцы, каб там паспрабаваць адшукаць адказы на набалелыя пытанні. Гэта пашырала кругагляд, вучыла аператыўна змяняць (а, значыцца, паляпшаць) сюжэт. Гэта падкрэсліў М. Арочка: “Дарэчы, потым ён [А. Куляшоў. – *А.Н.*] выдатна пацвердзіў, наколькі арганічна для яго прынцып раскаванай сюжэтнасці (“Сцяг брыгады”, “Цунамі” [1, с. 423].

Таму і не здзіўляе, што зло не толькі нараджае. Яно нават у самім сабе спакойна існаваць (знаходзіцца) не можа. Не зададзены злу такі стан, яно павінна пастаянна дзейнічаць, знаходзіць недзе і ў нечым сваё выйсце. Тады яно жыве, раскашуе. Зло можа быць і “адкладзеным”, што тым не меней не змяншае ягонай “адкладзенай” адмоўнай сілы, уздзеяння. Толькі найбольш небяспечнае зло пастаянна дзейнічае. Гэта ягоная непасрэдная “родная” стыхія. Паэт ужо ведае, выдатна разумее гэты глыбінны працэс усяго Сусвету. А. Куляшоў ведае і іншае: далёка не ўсё залежыць ад простага чалавека, ад таго, што яму мроіцца спакойнае і незалежнае жыццё, нейкі райскі куточак, міфічны Эдэм, дзе быццам бы не дзейнічаюць сілы зла. Але ж уцёкі ў той самы куточак – гэта і свядомыя ўцёкі ад невырашальных жыццёвых праблем, ад зямных цяжараў і клопатаў: “Які прастор! Іх лодкі незалежнай // Цяпер ніхто не будзе ўладаром. // Наперадзе – далечыні бязмежнай // Нязнаны край. Былое за бартом” [2, с. 283].

З логікі жыцця (праверанай шматлікімі пакаленнямі продкаў) выцякае наступнае правіла: адно зло закранае (чапляе) другое і г.д. Магчыма, што гэта і ёсць той адвечны “ланцуг зла”. Ён ніколі не ржавее, яму не даюць



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зрабіць гэта людскія ўчынкі, дзеянні, намаганні. Разважаючы пра помсту, нельга забываць і яшчэ пра адну крыніцу зла – чорную зайздрасць. Яна – чорная, неразважлівая, усёпаглынаючая, палонячая чалавечую душу да самых яе драбніц, не пакідаючая ў ёй нават самай дробязнай схованачкі для нечага добрага, справядлівага. А. Куляшоў надзвычай узмацняе сваю задачу: папярэдзіць Чалавецтва, што яно знаходзіцца на мяжы супрацьдзеяння з незразумелай многім увогуле і не бачнай звычайнаму воку сілай – наступствамі "мірнага атаму". Як піша М. Арочка: "Тут [у "Цунамі". – *А.Н.*] выразна чуецца дыханне трагедыі. Праўда, яе прыход разумеўся па-ранейшаму з таго ж заходняга кірунку, з-за акіяна. Ніхто не ўяўляў, якія катастрофы "мірны атам" ужо выспельваў пад бокам, у Сібіры, у Чарнобылі. Але паэма Куляшова відушча прадвяшчала рэальную магчымасць ядзернай трагедыі ўвогуле. Гэта паэма з ускладнёнаматоўным, шматпланавым падтэкстам. Паэт не карыстаўся паэтыкай міфатворчасці народа" [1, с. 447].

Творца спрабуе па-свойму навучаць герояў паэмы: "Вы не адны, – іх папярэджваў цынік, // Няўжо не будзе вас палохаць час? // Вы на Зямлі пакінулі гадзіннік, // Але гадзіннік не пакінуў вас" [2, с. 285]. Адчуваецца падрадкоўнае: чаму мы сталі такімі чэрствымі і абыякавымі да ўсяго таго, што называецца чужым горам? Нашы продкі паступалі мудра, бо для іх не было чужога гора, імі ўсё ўспрымалася як асаблівае, ўзаемазвязанае, уплываючае на племя-род, на сям'ю, на нашчадкаў. Не выключана, што гэта перасцерагала, у многім стрымлівала, астуджала гарачыя галовы. Але тут задаецца і супрацьлеглае заканамернае пытанне: менавіта там, у глыбіні стагодддзяў, выспявала гэтае самае ўсёапаноўваючае зло. Яно памнажалася, мацнела разам з ростам сацыяльнасці тагачаснага грамадства. І ў гэтым бачылася своеасаблівая заканамернасць: зло самаўдасканальвалася, шліфавалася разам з іншымі асаблівасцямі людской душы, характару, яго непаўторных уласцівасцяў. Зло ні ў якім разе не адставала ад поступу жыцця. Калі б яно развівалася як нейкая самастойная катэгорыя, то можна было б гаварыць пра тое, што яно "баялася адстаць", а, як вядома, даганяць заўсёды значна цяжэй. Нават у такіх сітуацыях: "Дум не заменіць вам пасцель з травы, // Якой вы ўсё жытло сваё заслалі. // Калі яе салонай зробяць хвалі, // Аб чым тады падумаеце вы?" [2, с. 286].

Толькі не будзем забывацца і пра іншае: адвеку ў прыродзе і ў грамадстве ўсё існуе не іначай, як "па пары", ці "ў пары". Пары гэтыя можна называць па-рознаму: "плюс і мінус", дабро і зло, браты і сёстры, дэміургі і г.д. Тым не меней як ні называй, а сутнасць ад гэтага ўсё роўна не змянілася і не зменіцца. І зноў-такі прычыны ўзнікнення зла былі тымі ж, што і сёння – помста і зайздрасць, а яшчэ неабходна сюды дадаць і пазней узнікшую прагу нажывы. Да яе імкнуліся любым чынам, любым шляхам, любымі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сродкамі. Ох, колькі людзей яна згубіла! Не толькі бедных зайздроснікаў, але і найбагацейшых людзей таксама! Перад сілаю нажывы, асабліва калі гэта бачылася даволі простай, нерызыкоўнай і такой прыбытковай справай, ніколі не спыняліся. Не задумваліся асабліва, што гэта магло каштаваць чалавечага жыцця, перарваць існаванне цэлага роду-племені, асобна ўзятага народа. Ніштo не стрымлівала. І нават славутае правіла – "на памылках вучацца" – тут не спрацоўвала, бо перад вачыма быў і іншы прыклад, як падавалася, зусім станоўчы і ўвогуле нічым страшным не пагражаючы, – імклівае ўзбагачэнне кагосьці са знаёмых, блізкіх, бедных ці, няхай сабе, і вяльможных асоб.

Не забудземся ў гэтым плане і пра сацыяльнае зло. Яно таксама ў многім спрыяла ўзнікненню і ўзмацненню, разбураючы да асноў любы грамадскі лад, сіл зла. І нікога, відаць, не здзіўляе, што адной з адвечных пар, узаемавыключальных, але разам з тым і не існуючых паасобку, была спрадвечная праўда – крыўда. Узнікшая недзе ў самых глыбінях, а хочацца ўсё ж сказаць па-іншаму – зароджаная ля першавытокаў станаўлення чалавецтва, бо так ужо атрымалася, што людзі, нібы самі па сабе, адразу падзяліліся на два вялікія (і ўжо даўным-даўно існуючыя!) класы багатых і бедных – прыхільнікаў крыўды і праўды. Вядома, што і праўда ў кожнага была свая, і разумелася ды тлумачылася яна па-рознаму, па-свойму. Тут на першы план выходзіла ўжо класавае зло, якое паступова фарміравалася ў класавую, антаганістычную нянавісць. Гэта была (ды і цяпер застаецца, чаго ўжо там нешта выдумваць) настолькі магутная разбуральная сіла, што вяла да руйнавання цэлых палітычных сістэм. І ўсё гэта адбывалася з-за пастаянна ўзрастаючага сацыяльнага зла.

Значыцца, не памыліўся А. Куляшоў у сваіх прадчуваннях, але з'яўляючыся шчырым прыхільнікам сацыялістычнага ладу жыцця, не змог, відаць, правільна ацаніць маштабнасць пагрозы "мірнага атаму". Цунамі – параджэнне землятрусаў, таксама з таго пераліку страшэнных прыродных катаклізмаў, якія вынішчалі цэлыя гарады і вялізныя зямныя тэрыторыі. Але ж цунамі маглі быць і наступствамі выпрабавальных (падземных, падводных і паветраных) выбухаў "мірнага атаму". "Мінулі шторм. Выратавання святам // Мог ціхі момант стаць для іх, калі б // Не ўскінуў век, ахрышчаны Дваццатым, // На даляглядзе выбуховы грыб. // На трыццаць міль вакол, на мілі ўглыб // Смерць выпраменьваў вызвалены атам- // На векі вокамгненне стала катам// Для шхун рыбацкіх, рыбакоў і рыб" [2, с. 288–289].

Зло ў такім плане – глабальная сіла, якая вымушае ўвесь Сусвет ў любым выпадку лічыцца з сабою. Нават увогуле не дапускаецца думка, што яго можна проста "перасядзець" недзе ў баку, зашыўшыся ў нейкі цяжкадаступны куток планеты. Справа ў тым, што ўсёўцягвальнасць гэтай



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

сілы такая вялізная, што ў яе кругаварот пападаюцца не толькі паасобныя людзі, пэўныя рэгіёны і народы, але нават мацярыкі. І праяву такога глабальнага зла не трэба шукаць у нейкіх канкрэтных падзеях, бо ўсё, што стане адбывацца навокал (ці адбываецца ад пачатку і да канца!), будзе бесперапынным дзеяннем з яго жахлівымі наступствамі таго ўсеагульнага зла. Яно нават прыпыніцца адразу не можа. “Як можаш ты забыцца ў лесе гэным // На выбух той, што ўсе лясы наскрозь // Прасвечвае, трымае пад рэнгенам // Луг і паляну, дзе пасецца лось?” [2, с. 291].

Здаецца, што М. Арочка правільна ацаніў творчую задуму А. Куляшова калі падкрэсліў: “Ён [А. Куляшоў. – *А.Н.*] сам тварыў шматзначную прытчу, міф – своеасаблівую “адысею” вандраванняў і выпрабаванняў сваіх герояў – Яго і Яе. На лёсе іх рызыкоўнай вандроўкі па акіяну на першабытнай пірозе паэт вырашыў паставіць як бы своеасаблівы эксперымент, прасачыць, як будуць сябе паводзіць Ён і Яна, аддаўшыся спрадвечнаму жаданню: у акіяне жыцця пад ветразем кахання адшукаць утульны кут. Героі апынаюцца перад творам адвечных стыхій жыцця – кахання, волі, адвагі, сумленнасці. Трывогі зямлі, шумны свет, здавалася б, пакінуты за плячыма. Аднак даплысці ў свет першабытнай цішыні ім так і не суджана было. Паваротным момантам у развіцці ўмоўнага дзеяння становяцца агучаныя алітэрацыяй радкі: “А ветразі дванаццатага веку // Сустрэчным ветрам век дваццаты рве” [1, с. 448].

Здавалася б, у такім выпадку зло выступае не вельмі здольнай да супраціву сілай, слабой нават у сваёй самавызначальнасці. Вядома, што ў такім плане зло – гэта простая пазбаўленасць дабра, і таму перамога над ім нішто іншае, як заканамернасць, зараней прадвызначаная ці не натуральным працэсам пераадолення, змагання, вечнага супраціву. Атрымліваецца (нібыта!), што тут нічога ўжо не пераменіш, бо ўсё „запраграмавана“ наперад самой логікай адвечнага ладу жыцця. Як бы тое злое, адмоўнае, негатыўнае ні выпіралася наперад (на паверхню, на пярэдні план), ўсё роўна яно асуджана на паражэнне.

Такім чынам, зло (катэгорыю зла) можна трактаваць зыходзячы не толькі з сацыяльных, побытавых, але і з філасофскіх канонаў: як дзейсную, даволі ваяўнічую сілу. Тады адмаўленне ад яго будзе выступаць перад намі не нейкім “заканамерна-натуральным”, а своеасаблівай маральна-духоўнай каштоўнасцю. Дарэчы. характэрнай усім далёка не ў раўназначнай прапорцыі. А. Куляшоў выдатна ведаў гэта і спрабаваў яшчэ больш абагуліць, падкрэсліць адмоўную значнасць страшнай праявы: “Яблыкам разладу // Зямля ляжала паміж ёй і ім” [2, с. 295]. І таму тут ужо зло неабходна тлумачыць як нешта самастойнае, самасцвярджальнае, якое пастаянна прысутнічае ў душах людзей, але “да часу” яшчэ не абуджанае, не запатрабаванае.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Канешне, нараджэнне зла, яго першакрыніцу, узмацняльнік злых намераў можна знайсці ў эгаізме чалавека (лакальнае), чалавецтва, людзей (глабальнае). Лёгка такую пазіцыю растлумачыць – для "самаадмаўлення" эгаізму зла патрабуецца (першапачатковая ўмова!), яго папярэдняе самасцвярджэнне, каб адмовіцца ад сваёй выключнай волі, па логіцы рэчаў неабходна спачатку мець яе. Мала гэтага, прыватныя пачаткі і сілы найперш павінны адасобіцца, "адысці" ад агульных, а таму разглядаемых як агульначалавечыя, гуманныя, прынцыпаў і канонаў і імкнуцца да выключнага валадарства. Відаць, такое разважанне цалкам лагічнае, бо навошта тады было ўзнікаць сусветнай субстанцыі зла, напрыклад, калі адкінуць ідэю перавагі, лідарства і ўсё таго ж валадарства? Але тут ненабходна разглядаць яшчэ і іншы аспект – гэтае памкненне магло быць важным і абавязковым у першую чаргу для таго, каб зло (прапаведнікі, носьбіты зла) на вопыце змаглі пераканацца ў карэннай няздольнасці свайго самасцвярджэння і (як заканамерны вынік!) злучыцца з агульным пачаткам безумоўнага дабра, усёахапляючага і ўсёапаноўваючага.

Вось і ў творы А. Куляшова "Ускалыхнутая атамным выбухам акіянская хваля-цунамі спачатку не ўяўлялася, як сапраўдны "гнеў зямлі", як трагедыя. Трагедыя прыйшла пазней, ужо на зацішным востраве, куды Яна, каханая, дамаглася завітаць – героі чакалі нараджэння новага жыцця. Ды зацішны востраў стаўся месцам трагедыі, якая сімвалічна папярэджвае чалавецтва: "Калыску памяць вострая змайстрыла. // Хіба магла наперад памяць знаць, // Што суджана труной калысцы стаць, // Што першай нянькай будзе ёй магіла, // А полагам – той самы чорны сон" [2, с. 297].

Як бачым, атрымлівалася, што абвастрэнне супрацьстаяння паміж дабром і злом нібы прытуплялася (знаходзілася на першаснай стадыі свайго канфлікту, але не дасягала верхняй мяжы, што своечасова "ўмешваўся" той самы "матулін аспект"). Вядома, яго можна назваць і агульным – бацькоўскім, але, тым не меней, усё ж матуля заставалася адвечным гарантам прыпынення гэтакіх канфліктаў. "Спіць сын, руку паклаўшы на руку. // Той выбух, ад каторага ўцякалі // Бацькі, той смерці атамныя хвалі// Яго дагналі. Тут. На астраўку" [2, с. 298].

Гісторыя чалавецтва, упэўнены паэт, пераканала нашых продкаў у тым, што зло шматаблічнае, што яно хаваецца (у любых сітуацыях!) пад рознымі маскамі і таму пастаянна абнаўляецца "арсенал" сродкаў барацьбы з ім. Да гэтага вымушае адвечнае супрацьстаянне зла і дабра, бескампрамісная вайна, у выніку якой шмат разоў пераможанае зло тым не меней не гіне, а проста "змяняе сваю маску", набывае новую праяву ці выгляд. Гэтая барацьба прысутнічала ў міфалогіі і вуснапаэтычнай творчасці, у рэлігіі, якой бы яна ні была, у сацыяльным грамадстве. А. Куляшоў разумее, што яна вядзе свой радавод "ад самага пачатку" – ад стварэння Сусвету.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Самае цікавае, што пачынаючы недзе з таго сівога перыяду гісторыі чалавецтва нашы продкі любым чынам імкнуліся перамагчы зло. Ды не тут тое было! Як нельгаператварыць праўду ў хлусню, няхай сабе яна будзе бессвядомая і зараней не прадугледжаная, так немагчыма таксама ператварыць у дабро зло, няхай сабе яно будзе адвольнае ці неадвольнае, але затое яго можна падпарадкаваць дабру, мінімізаваць і нейтралізаваць сілу і дзейнасць зла, звесці яго да нейкага зусім нязначнага локуса. Тым не меней, наступная думка перасцерагае назаўсёды: "Няма шляхоў да самазахавання, // Няма дарог да светазабыцця // У час ліхі ўзаемапалявання // Сіл супрацьлеглых: смерці і жыцця" [2, с. 298–299].

Так павялося, што зло ўзнікла ("нарадзілася") разам з дабром, "па ўзросце" адпавядае перыяду ранняга язычніцтва і, акрамя гэтага, заключае ў сабе яшчэ агромністую сілу, энергію самасцвярджэння і па гэтых крытэрыях ні ў якім разе не саступае пазіцыям дабра. "Звужэнне" зла можа адбывацца толькі ў канкрэтных (нязначных) выпадках, у астатніх жа яно знаходзіцца ў глабальным значэнні, па-ранейшаму роўнасным дабру. Пазіцыя такая, на вялікі жаль, для сумленных людзей амаль непахісная, так бы мовіць, "у прасторы і часе". "Датуль, пакуль яго пагібель свет // Тваім апошнім не аплакаў словам. // Хай не плітой чыгуннага ліцця // Яно гучыць. Хай ляжа, як насенне, // У грунт, з якога ўзыдзе абурэнне- // Тваё непахаваанае дзіця" [2, с. 299].

А. Куляшоў канстатуе, што чым болей чалавек пражыў на белым свеце, "чым даўжэйшы ягоны век", тым болей сутыкненняў дабра і зла ў самых розных сітуацыях паспеў ён заўважыць (адзначыць, зафіксаваць і г.д.). Бясспрэчна, даволі часта (у крайнім выпадку – не адзін раз) любому з людзей даводзілася быць міжвольным сведкам, а то і ўдзельнікам тварэння зла ці, наадварот, дабра ў такіх канфліктных сітуацыях. Вядомы і яшчэ адзін аргументаваны факт: хацеў ты ці не хацеў, жадаў ці не жадаў, але ўсё роўна вымушаны быў прыняць удзел на баку адной з гэтых сіл. Заставацца абыякавым сузіральнікам тут проста не выпадала. Здавалася б, самая выгодная пазіцыя – заставацца ў баку, але і гэта няправільна, таму што абыякавасць, адмова ў дапамозе, нават простае неасуджэнне сіл ці праяў зла таксама здольны чыніць вялікае зло: забіваць, гвалтаваць, прымушаць заўчасна сыходзіць з жыцця і г.д. Таму кожны чалавек павінен трымацца за іншага, а той – яшчэ за іншага, утвараючы такім чынам усеагульны ланцуг супрацьстаяння навале, бядзе, стыхіі (цунамі): "Хто б ні былі яны, а толькі зноў // Яны – жыцця людскога сувязныя, // Дзве долькі неразлучныя, якія // Вякам перадаюцца ад вякоў" [2, с. 303].

Можам смела зазначыць, што "У "Цунамі", як і ў "Маналогу", прагучала ўласцівая для куляшоўскага светаадчування трагічная тэма. Талент паэта выявіў у сваёй прыродзе грані менавіта трагічнага светабачання. Філасофская катэгорыя – смерці і жыцця – уваходзіць у паэтычны эпас Куляшова пераважна ў набалелым сацыяльна-грамадскім аспекце, набываю-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

чы глабальную маштабнасць. Трагедыя выступае як адно з самых высокіх увасабленняў мастацтва. У сваіх асэнсаваннях трагічных момантаў паэт заглыбляецца ў складаны філасофскі і сацыяльны змест і, мабыць, найбліжэй падыходзіць да выяўлення "прагі ідэалу" (Ч. Айтматаў). Перажыванне самога моманту трагедыі прабуджае вышэйшы стан творчага і духоўнага жыцця – вышэйшую гатоўнасць у імя жыццесцвярджэння" [1, с. 448].

"Мая хата з краю" – рана ці позна даводзілася канстатаваць: "з краю", ці збоку застаюцца толькі да пэўнага часу, да канкрэтнай мяжы. Яе можна акрэсліць тым момантам, калі гора, бяда, зло закрануць цябе самога ці тваіх блоізкіх і родных, а таму, значыць, і фіксаваў сваю жыццёвую пазіцыю. Тут адразу многае перайначвалася, змянялася ў рэзка супрацьлеглым напрамку (не гаворачы адназначна: у бок дабра ці зла, бо невядома, да чаго прыходзіў канкрэтны чалавек у пэўнай сітуацыі). Мала гэтага, калі нехта раней пастаянна падкрэсліваў уласную нейтральнасць (абыякавасць, раўнадушша), то тым самым дэманстраваў, а таму, значыць, і фіксаваў сваю жыццёвую пазіцыю. Змена яе ў выніку пэўных (сацыяльных, сямейных) абставін адбывалася "навідавоку", на вачах у многіх сведкаў, якія ўжо маглі аналізаваць не толькі папярэднія, абыякавыя адносіны, але і іхнія наступствы. Сітуацыя станавілася амаль што "празрыстай", нават з улікам таго, як адзначае А. Куляшоў, што самі яе стваральнікі далёка не заўсёды жадалі гэтага.

**Літаратура**

1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя ў чатырох тамах. – Т. 3 (1941–1965). – Мінск, 2001. – 951 с.
2. Куляшоў, Аркадзь. Збор твораў у пяці тамах. – Т.2. Паэмы. – Мінск, 1975. – 303 с.
3. Пяцьдзясят чатыры дарогі. Аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў. – Мінск, 1963. – 551 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова